Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Віленская вул., № 29.

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей„ хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 6 Лютаго 1915 г. № 5

## Чародная задача.

Спадзяючыся на лепшае заўтра, нельга сядзець, злажыўшы рукі, сягоньня.

І што-б ні прынесла с сабой вайна, што-б яна ні суліла нам у будучыні, — мы павінны ўжо цяпер прыгатаўляцца да гэтай будучыні, думаць аб ёй, шукаць дарог да яе.

Адна думка злучае ўсіх грамадзян нашаго краю: гэта—дайсьці таго, каб шкоды, якіе робіць нам вайна, як найменш адбіліся на нашым жыцьці. А дзеля гэтаго трэба, каб народ, спазнаўшы сваю моц, спазнаўшы, якую сілу ён можэ мець, калі ўсе пойдуць разам да аднэй мэты,—устаў да вялікай культурнай працы дзеля вызваленьня сябе с путаў цемнаты, беднасьці і паняверкі.

Праз вайну счэзла адна беда: страшэнная ўласьць гарэлкі. Гарэлкі німа,—і калі дзе-не-дзе людзі, ласые да гэтай атруты, гонюць яе с палітуры ці дэнатурату, дык гэта невялікі страх. Горшы страх, што с канцом вайны можэ йзноў вярнуцца п'янства, што народ, прывучэны да яго праз сотні гадоў, мо' йшчэ не здалее забыцца аб гарэлцы, ня знойдзе, якой уцехай замяніць гэту „весялуху“, што за момэнт вясельля губіла часта-густа ўсё жыцьцё чэлавека. І ўжо цяпер трэба панатужыць свае сілы, каб народ знайшоў новые — культурные способы цешыць душу і сэрцэ.

У ліку культурных уцех першае мейсцо займае тэатр.

Хараство думкі, хараство ідэі ён злучае с хараством слова, песьні, абразоў. Ён у шэрые будні жыцьця нясе с сабою новые, моцные перажываньня, дае можнасьць перажыць такіе цудоўные мамэнты, аб якіх адно у сьне даводзіцца сьніць «шэрым людзям...» Ён будзіць у нас сьведомасьць жыцьця, сьведамасьць, што мы жывём.

Даць гэткую ўцеху вёсцы — гэта значыць збудзіць у ёй новае жыцьцё, падняць у верх—на цэльнае неба! Разумеючы гэта, усе культурные работнікі ўжо пачалі працаваць, каб ня толькі вялікшые гарады мелі тэатры, але каб і наша вёска пазнаёмілася з ім.

Цяжкая гэта работа. Многа працы, многа сіл вымагае. Тым болей трэба рупіцца аб тое, каб яе зразу жэ добра, акуратна наладзіць, каб праца грамадзянства не змарнавалася.

Каб народны тэатр быў праўдзівай школай жыцьця, каб клікаў людзі на сьветлую дарогу да вялікіх сусьветных ідэалоў, ён павінен быць родным для народу. Гэта значыць: іграць у ім трэба ў роднай мові нашых селян, трэба ставіць драматычные творы каторые адбіваюць блізкае, зразумелая для вёскі жыцьцё. На гэтым павінны і мы будаваць наш народны тэатр.

## ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце**. Пасьля страшэнных крывапраліцьцяў на левым беразі Віслы—дзе Божымов і Болімов,—неўспадзеўкі увесь ціжар змаганьняў перакуліўся на правы бераг Віслы і пашырыўся аж да Нёману. Што прынясе гэты новы рух у расейска-нямецкай барацьбе — згадаць трудна, аднаго толькі можна дагадывацца—гэта такой ці іншай новай перамены у гэтым змаганьні мільёнаў. Весткі Штабу аб бітвах у районі паміж Віслай і Нёманам такіе: 28 студня у Усходней Прусіі акуратна высьвятлілося зграмаджэньне немцамі вельмі не малых сіл, каторые, перайшоўшы ў наступленьне, пашыраюць яго найболей у напрамках к            і Лыку. Расейскае войска, стрымліваючы праціўніка, атходзіць ад лініі Мазурскіх вазёр к расейскай пагранічнай паласе. На фронце праваго берагу Віслы адбываліся рэдкіе стычкі у напрамку ад Мышніца к Остролэнцы і ў районі Сэрпец, каля рэкі Скрвы. 29 студня на фронце між дольным Нёманам і Віслай аддзельные боевые стычкі адбываліся к захаду ад Марграбова, каля Лыка,

к захаду ад Мышніца і ў районі Сэрпца. 30 студня на фронце Нёман—Вісла бітвы адбываліся

Лыка, каля Кадзідло, і к усходу ад Сэрпца. Немцы ў районі Лыка мелі значные страты пры адбіваньні расейцамі іх атак. 31 студня бітвы на правым беразі Віслы пашыраюцца. На фронце ад Мохова да дарогі з Мышніца на Остролэнку яны маюць характар аддзельных стычак. У районі Лык—Райгрод—Граево бітвы вядуцца з немалой заўзятасьцяй. Болей на поўнач расейскае войска, пад напорам значных нямецкіх сіл, адходзіць у напрамку на ўмацаваную лінію рэкі Нёману. 1 лютаго бітвы адбываліся болей-меней у тых-ж районах, што і 31 студня. 2 лютаго ў районі Августова расейскае войска заўзята змагалося з большымі на лік нямецкімі сіламі, каторые мецюцца абхапіць абодвы крылы расейцоў. Ад Граева непрыяцельскіе атрады («калонны») пасовываліся у напрамку к Осовцу. Між Віслай і Вкрой праціўнік дасьціг фронту Плоцк—Раціонж. 3 лютаго бітвы на правым беразі Віслы неспыняюцца, болей-меней, у тых-жэ районах, прыймаючы на некаторых участках страшэнна заўзяты характар. К старане Нёману у праціўніка адны раз'езды.

На *левым беразі Віслы* адбываецца толькі гарматняя перастрэлка.

На *Карпатах* заўзятые і крывапраліўные атакі аўстро-немцоў і расейскіе проці-атакі не спыняюцца. 28 студня атакі праціўніка ад Мезо-Лаборча на Яблонов, што на ўсход ад перэвалоў Ужок, і наступленьне немцоў на высоты Козювкі расейцы адбілі. 29 студня расейцы адбілі непрыяцельскіе атакі ў районі Свідніка каля Вышкова, Парогі каля Раттокі, што блізка граніцы Буковіны. У районі Лютовіска расейскае войска заўладало часткай непрыяцельскіх акопоў пры чым расейцы ўзялі у палон 500 людзей і 3 кулемёты. 30 студня расейцы захапілі умацаваные высоты ў районі Сьвідніка і між перэваламі Лупков і верхнім Саном. На фронце між перэваламі Ужок і Тухолка расейцы крыху паціснулі немцоў на высоту каля Козювкі. Немцы акапаліся за 40 шагоў перэд расейскімі акопамі. Каля Вышкова заядлые атакі праціўніка адбіты. 31 студня расейцы адбілі атакі праціўніка ў районі Горліцэ і каля Свідніка і заўладалі непрыяцельскімі акопамі і украпленьнямі каля Смольніка, што на ўсход ад Лупкова. Упорные бітвы адбываюцца на фронце Тухла — Вышков і на шляхах к Надворнай. 1 лютаго расейцы адбілі заядлые атакі аўстрыякоў каля Свідніка і некольکі пасунуліся на левым беразі верхняго Сану. Немцы, атакаваўшые высоты каля Козювкі і між перэваламі Бескід і Вышков, адбіты з вялікімі стратамі. Ад Тухлы і Вышкова расейскае войска перайшоўшы у проці-атаку, збіла праціўніка с часткі умацаваных ім высотоў. На шляхах к Буковіне і Надворнай высовываюцца немалые сілы аўстрыякоў. 2 лютаго расейскае войска пасунулося наперад на левым беразі верхняго Сану і ўзноў адбіло заядлые нямецкіе атакі каля Козювкі і Вышкова. У Буковіне праціўнік заняў Надворную і пераходзіць рэку Сэрэт. 3 лютаго. У Галіччыні атака праціўніка на фронце Хава—Выркоч адбіта. Болей на ўсход праціўнік безкарысна мецiўся атакаваць расейцоў ў районі Лубнэ і Студзеннэ. На фронце ад Козювкі да Вышковскаго перэвалу немцы праз увесь мінуўшы дзень некольکі раз кідаліся ў вельмі заўзятые атакі, глаўным чынам напіраючы на Вышков. Усе гэтые атакі адбіты, пры чым немцы панесьлі вялікіе страты. У Боковіне без важных перамен.

**С Каўказкаго фронту** вестак ад Штабу Каўказкай арміі за гэты тыдзень не было ніякіх.

**На Заходнім фронце** звычайная гарматняя перастрэлка ды час-ад-часу нямецкіе рэдкіе атакі.

**Неваюючые дзержавы** пакуль што седзяць ціха, хоць бізупынна к вайне рыхтуюцца; кожнае яшчэ з гэтых эўропэйскіх гасударствоў не знае с кім узяцца за чубы. Гэтак, **Болгарыя**, седзючы ціха, пажычае у Нямеччыні грошы і якобы за гэта штось там немцам абецала. **Румынія** іграіць у двайную палітыку, будзючы недавольство у «Нов. Вр.», каторае жадало бы лепей бачыць у румынах аткрытаго ворага Расеі, чымся няпэўнага прыяцеля. А Румынія, Болгарыя і Грэція баяцца, каб расейцы не ўмацаваліся вельмі на Балканах, асабліва як запануюць над праліваамі, бо тады гэтым дзержавам дужа якобы не ў карысьць будзе такое суседзтво. **Швэція** з Расеяй не задзіраецца, але збожэ, куплянае праз швэдоў у Расеі, ідзе далей у Нямеччыну. **Італія** здаецца задаволіцца невялікай уступкай куска зямлі Аўстрыей і ў вайну ўмешывацца ня будзе, к таму-ж сільные вельмі там дзьве парціі—соціал-дэмократы і католікі настроены проці вайны.

## На вайне і каля вайны.

**Аб чым яны шкадуюць.** Ранены афіцэр, ужо выздараўліваючы, расказываў супрацоўніку «Г. М.» аб жудасных мамэнтах кананьня:

— Толькі стоючы пад агнём ворага, толькі знайходзючыся кожны міг у непрарыўным чэканьні сьмерці, пачынаеш патроху разумець, які гэта неацэнены, шчасьлівы дар—жыцьё, як дорага павінна быць кожная хвіліна, як дорага кожнае жыцьцё чэлавеччэ... І туманна спачатку, але ўсё ясьней і ясьней пачынаеш разумець і вось яшчэ што: так, гэта-ж я яшчэ зусім ня жыў, гэта-ж усе людзі яшчэ не жылі, яшчэ ня ведаюць, як прыгожа можэ быць жыцьцё. Вы ня можэце зразумець, як гэта робіцца ясна перэд воблікам сьмерці... У мяне побач са мной, у той-жэ бітве, дзе я быў ранены, таварышу папалася асколкам гранаты у грудзі. Яму развярнуло бок, абгаліло жэбры, раскрышыло грудную клетку. Жыць яму, калі я нахіліўся над ім, асталася мінута, а да непрытомнасьці, можэ быць, некольکі мігоў... Я разумею, што тое, што я зрабіў, было, можэ быць і дрэнна, і гідка з маей стараны, але я так заўсёды цаніў яго глыбокі, абдуманы погляд на жыцьцё, што нават цяпер, у сьмяротную мінуту яго, у міг, калі ён, разлучыўшыся з жыцьцём, падводзіў яму апошні

рахунак, я не стрымаўся ад халоднай цікавасьці і спытаўся яго.

— Ну, скажы, скажы толькі шчыра, што чуеш ты апрача болю ад ран. Можэ быць шкадуеш чаго, каешся?

Ен закратаў пасінеўшымі губамі і ціха, ціха, чуць чутна, як засыпаючы, шэпярнуў:

Шкада... аднаго, ня даведаюся, не ўбачу, як вы, жывые, будзеце жыць тут, на зямлі, па... па... н о в а м у.

Ен уздыхнуў |разбітымі грудзямі, выцягнуўся, як струна, якбы стаў перад некім у апошні раз «ва фронт» і... памёр..

**Стараньне аб адмені ваеннай цэнзуры.** Цэлы рад аўстрыяцкіх хаўрусоў і корпорацій звярнулося к міністр-прэзыдэнту з агульнай заявай аб адмене ваеннай цэнзуры, глаўнае аб пазваленьні газэтам свабодна талкаваць аб варунках будучэй згоды. «Arb. Zeit.» у перэдавой стацьці пішыць, што цэнзура зусім задушыла чэшскі друк і што гэта неразумная рэпрэсія прычыняецца к сур'ёзнаму безпакойству сярод чэхоў. Як кажэць газэта, прадаўжэньне цэнзуры грозіць Аўстрыі вялікай небаспечнасьцяй у самай блізкаў будучыні.

**Не на жыцьцё, а на сьмерць...** У атказ на нападкі на Нямеччыну с прычыны бомбардоўкі «цэппэлінамі» гарадоў Англіі, нямецкі урад у сваей газэці кажэць: «нямецкая нацiя ваюець не на жыцьцё, а на сьмерць, і ніхто ня можэ прымушаць яе атказацца хоць ад якаго-бы спосабу самоабароны». Нямецкіе часопісі падтрымліваюць урад, кажучы: — «гэта толькі пачатак. Англія хочэ зністожыць нас голадам, а мы будзем ністожыць англічан усімі мажлівымі нам спосабамі».

**Страты англіцкаго і нямецкаго флота.** Павэдлуг рахунку да 1 лютаго 1915 г. Англія захапіла у моры і затрымала у прыстанях 445 нямецкіх тарговых караблёў. 505 нямецкіх і 50 аўстрыяцкіх караблёў укрыліся у прыстынях неваюючых державоў. У нямецкіх прыстанях на пачатку вайны было сэквестравана (забрана) 79 англіцкіх караблёў. Нямецкімі ваеннымі караблямі было, апрача таго, захоплено 45 англіцкіх параходоў далёкаго плаваньня, ня лічучы рыбалоўных караблёў. Гэткім парадкам страты англіцкаго параходзтва раўняюцца ⅓ нямецкіх страт на моры.

**Прыгатаўленьні турак.** Туркі не перэстаюць старанна прыгатаўляцца к веснавым ваенным змаганьням. Трэцяя турэцкая армія хутка папаўняецца і узмацовываецца войскам с фракійскіх і сырыйскіх корпусоў. Дапоўніваньні ідуць двума шляхамі: па анатолійскай і багдадскай чыгунцы, ад пачатковых станцій Базантыхан і Тэльлель Абьяда, затым ад Трапезунду і Хопы. Ёсьць прычыны думаць, што новае турэцкае наступленьне рыхтуецца павэдлуг пляну выпрацаванаго у сьнежні— папрабаваць абыйсьці расейскае правае крыло.

**На берагох Равкі.** «Русск. Вѣд.» паведамляюць, што на берагох Равкі немцы робюць ціхую «сапу». Яны ставілі рад сталёвых квадратных шчытоў, за кожны з якіх магло схавацца ат куль некольки сапероў (капаючых акопы). Апошніе ўзрывалі пласты зямлі, патроху перэсоўвалі шчыт у перад, робючы з выкінутай зямлі вал. Гэткім парадком акоп якбы сам блізіўся і якбы поўз на спатканьне расейцоў. «Сапа» рухаецца натта памалу: за тыдзень можна падыйсьці на 20 — 30 шагоў. Праціўнік зусім забаспечаны ад кулямётных і стрэльбавых куль, але шрапнэлі, падаючые зверху, для яго небаспечны, як для усялякаго другога. Расейская артылерыя кіравала агонь на мейсцы работ, зьбівала шчыты, руйнавала акопы і праганяла нямецкіх сапёроў. Там, дзе „сапаю" немцам пашанцавала прыблізіць акопы на 50 шагоў, расейцы пачыналі кідаць ручные гранаты. Імі перакідываліся з акопа у акоп, іх бралі с сабой і кідалі у часе атакі, нарэшці, імі бараніліся ад атакі праціўніка.

———

## Быу гэта сон...

Быў гэта толькі сумны сон
Душы расплаканай маей,
Што сярод бледных будніх дзён
Я сьвята меў, глядзеў сьвятлей.
    Быў гэта толькі сумны сон,
    Што быў я чымсьці для яе,
    Што мілы мне ў яе палон
    Мой быт у шчасьце абаўе.
Быў гэта толькі сумны сон,
Што у вачах яе скрось сьмех
Чытаў сьвяты сабе закон
Каханьня шчыраго і ўцех.
    Быў гэта толькі сумны сон,
    Што вось інакшая яна
    І пойме болю майго стогн,
    Зірне ў душу маю да дна.
Быў гэта толькі сумны сон,
Што развяду я з ёй бяду,
Што пад яе напевоў звон
Лягчэй к магіле дабрыду.
    Усё для мяне быў гэта сон;
    Хтось іншы яву меў ў жыцьці,—
    Ён ёй і мне стварыў прыгон,
    А сам сыйшоў, каб... не прыйсьці!

**Янка Купала.**

3/I—15 г.

———

## З народных песень.

**Ах ты горкае карэньне...*)**

Ах ты горкае карэньне—
    Ўсё крапіўнае,
Ах ты горкае жыленьне —
    Ўсё салдацкае:
А поўночы салдацікі
    Ружжы чысьцілі,
А пад бел дзень салдацікі
    Яны маліліся.
З белым сьветам салдацікі
    Ў паход пайшлі;
Не даходзючы да гораду
    Аддыхаць палягли.
Наехалі чужазванцы
    Ўсіх салдацікоў цатапталі;
Аднаго салдаціка
    Ды Бог мілаваў.
Паказалі салдаціку
    Тры дзрожкі ў боку:
Аднэй дарожкай пайці—
    К бацьку, матцы зайці:
Яны старые былі, —
    Дасюль памярлі;
Другой дарожкай пайці —
    К сястрэ, брацiку прыйці:
Яны маленькіе былі,—
    Дасюль па-сьвеці пайшлі;
Трэцьцяй дарожкай пайці —
    К маладой жане зайці:
Яна малада была,—
    Дасюль замуж пайшла.
Як ударыўся салдацік
    Аб сыру зямельку:
«Зямелька-чорназём,
    «Прыкапай ты мяне!
«Зязюлінька шэрэнька,
    «Пакукуй ты па мне!
«Бярозанька зялёнэнька,
    «Пазвані ты па мне!

*) П. Шэйн. «Матеріалы для изученія быта и языка русскаго населенія Сѣв.-Зап. края». Том I, часьць 1. Петраград, 1887 г.

## Залёты.

**Опэрэтка Вінцука Дуніна-Марцінкевіча.**

«...ў адраджэньню ўсякаго народу (украінцы) тэатр—сіла непамерная, а ў адраджэньню беларусоў, пры іх псыхіцы, пры іх дэмократызму, ён можэ сыйграць вялікую ролю».

*Максім Горэцкі.*

25 студня «Беларускі Музыкальна-Драматычны гурток» выставіў на сцэні опэрэтку «Залёты», напісаную каля поўвека таму назад (у 1870 г.) праз В. Марцінкевіча, — толькі музыку да слоў опэрэткі п. М. Кімонт дапасавала цяпер.

Змест опэрэткі дужа просты: Сабковіч, дабіўшыся праўдай і няпраўдай «с пастуха» да панства, дзеля збольшэньня свайго багацьця хочэ жаніцца з Адэляй, дачкой шанаванаго у павеці судзьдзі. Але, дзякуючы сваей хціўасьці, Сабковіч па дарозі ў сваты к Адэлі купляе крадзенаго каня, што і губіць яго у тым часе, калі ён госьціць у судзьдзі. К таму-ж Маршалак раскрывае перэд судзь-

## Грыгор с Касатаукі.

Сабраліся мы неяк раз вечэрам у вучыцеля Г. За шклянкай гарбаты гутарылі аб тым, аб сім і аб усім. Паміж іншым, зайшла гутарка і аб нашым селяніне — гаротным беларусу.

— Не,—пачаў, пыхаючы папіроскай і абтрэсаючы попел з яе, кудлаты, з вялікімі чорнымі вачыма студэнт-мэдык, прыехаўшый на сьвяткі дамоў: — не, як там не кажы, а шмат трэба папрацаваць, каб адкапаць у душы нашаго селяніна якое небудзь выжэйшае паняцьце, пачуцьцё, каторае-б выходзіла за абруб яго будзённаго жыцьця. Ніколі не ахвяруіць ён сябе дзеля чаго небудзь такога, што не прынясе яму ніякай карысьці. Хоць-бы гэтым і мог ён ратаваць другога ад якой бяды.

— Няпраўда,—горача азваўся вучыцель,— я жыву сярод селян, колькі гадоў; пазнаў добра іх і іхняе жыцьцё і магу пацьвярдзіць што ёсьць паміж іх так сама здольные на самаахвяру, як і паміж людзей іншых станоў. І часта-густа бываіць, што просты, неадукаваны чэлавек, цярпеў і мучыўся толькі дзеля таго, што меў добрае сэрцэ і выжэйшае нейкае пачуцьцё праўды.

— Ну, гэта хіба ўжо такіе героі спатыкаюцца у повесьцях або у вершах нашых сантымэнтальных народнікоў. У жыцьці гэтых выжэйшых пачуцьцёў нешта ня ўгледзіць.

— За тое, што вы не угледаецеся у жыцьцё. Я вам мог-бы расказаць шмат выпадкоў, якіе мне давялося чуць і відзець. Але лепей прывяду я вам чэлавека, каторы... с каторым... Ды ён вось сам вам ўсё раскажыць.

Сказаўшы гэта, вучыцель выйшоў і неўзабаві вярнуўся з нейкім чэлавекам, меўшым на пагляд, гадоў мусіць с паўсотні, з дабрадушным тварам і шчырым простым узглядам шэрых вачэй. Аблічэ яго адбівала такой дабратой, што ён адразу усім нам спадабаўся. Гэта быў гаспадар, у катораго вучыцель кватэраваў.

— Вот,—зьвярнуўся да яго вучыцель,— раскажы нам, калі ласка, Грыгорка, той выпадак, што некалі здарыўся с табой, як ты адвозіў палярэс пану N.— маім гасьцям цікава будае паслухаць.

— Што-ж там цікаваго, паночкі! Ат, вядома, глупства, хоць і пагараваў я ткі крыху тады.

— Раскажы, Грыгорка, раскажы,—пачаў прасіць вучыцель, падстаўляючы яму крэсла,— сядзь і раскажы!

Мы сваім чарадом, скінуўшыся па слову пачалі прасіць яго расказаць, і Грыгор, выпіўшы чарку гарэлкі, каторую наліў і падаў яму вучыцель, і разгладзіўшы сівеўшую бараду, абвёў нас усіх вачыма.

—«Было гэта,—пачаў грыгор сваё апавяданьне, — не так каб надта даўно, але і ня ўчора, бо неяк гадоў пэўна з дваццаць (прайшло с тэй пары, як служыў я за хурмана у пана N. Пан гэты быў ня можна казаць каб благі, ня дужа і добры. Вядома—пан. Прыехаў раз к пану у госьці, ягоны знаёмы а можа і сябра, пан Ківат, з мястэчка. Меўся ён у нас начаваць, але нешта абдумаўся і паехаў дамоў. Было ўжо пад поўнач як ён выехаў. Зачыніў я вароты у дварэ, зайшоўся у стайню, сена коням заклаў, каб досіць было да дня, і іду сабе на адпачынак,—аж бяжыць лёкай: „Ідзі—кажэ—Рыгор да пана. Пан—кажэ клічыць." „Штс—думаю—за трасца яму там? не супакоіўся яшчэ".—„Вось што Рыгорка—кажэ пан, як прыйшоў я да яго: забыўся тут пан Ківат палярэс с паперамі. Паперы— кажэ—гэты яму будуць заўтра дужа патрэбны. Дык запражы ты—кажэ—каня і не марудзючы доўга адвязі яму гэты палярэс".

— «Каб ты галаву сваю забыўся. Дух с цябе вон — думаю. — Цялепайся цяперака вёрст нейкіх дванаццаць па начы гэтакай растаропіцай ні ў санях ні на калёсах. — Не — думаю—запрагаць ня буду—дарога нягодная — паеду конна, вярхом значыць". Акульбачыў я гнядога—добры конь быў—і паехаў. Вось ад'ехаўся я вярсты нейкіе са тры і пад'еждзжаю к вёсцы, — Загацьце называлася вёска гэта. Бачу, — у кузьні, што стаяла крыху воддаль ад дарогі—агонь гарыць, гаманяць там—чую— бразгаюць. „Во зажора — думаю. — Цыпрук гэты, — каваля Цыпруком звалі,—ноччы працуіць; узбагацець захацеў чараўнік стары. Усё яму мала, паповы вочы. Заехацца, ці непаглядзець што ён там робіць? Не,—думаю— ня буду заеждзжаць". Сьцёбануў я каня і, неастанаўляючыся, паехаў далей. Прыехаўшы у мястэчка, паставіў каня у перавозніка Іцкі і пайшой да пана Ківата. У вакнах у яго— бачу—цёмна. Сьпяць ужо пэўне—думаю. Пан мусіць даўно ўжо прыехаў. Трэба—думаю— стукацца. Піхнуў я нагой неяк у дзьверы, аж яны і адчыніліcь. „Ну і розум-жэ у паноў — думаю: у глуш, ноч, і дзьверы не замкнёны. Гэтак можыць хто увыйсці, абакрасьці, ці, крый Божэ, яшчэ што зрабіць. Ці-ж гэта парадак?" Думаючы гэтак, увыйшоў я у пакой. Цёмна як у пеклі. Нічога угледзіць ня можна „Што тут — думаю — рабіць?" Аж чую ідзець нехта, лёганька так ідзець.—„Гэта ты, галубок мой? — чую шэпчыць нехта, — што так спазніўся?"—і не пасьпеў я апомніцца, як абпчапіў мяне нехта за шыю дый цмок у вусны, аж у галаве закруцілася ў мяне. — „Пачэкай — чую—хвілінку, я дзьверы толькі замкну, тады лямпу запалю. Толькі ціха, не шемячыся, бо ў другім пакоі брат — кажэ — яго сьпіць". Толькі хацеў я сказаць, што вось прыслаў пан палярэс, аж штосьці загрухатала пад вокнамі,—быццам хто пад'ехаў, і пачуўся нейкі гоман. „Ах, Езус! гэтаж „ён" прыехаў, — зашэптала паня (а гэта яна была) і схапіўшы мяне за руку, пацягнула за сабой. — „Гэта-ж не дай Бог „ён" засьпеіць цябе тутка у гэтай парэ!.." І не пасьпеў я адумацца, як яна, адчыніла нейкіе дзьверцы, піхнула мяне, дзьверцы зачыніліся, і я апынуўся у нейкай шафі. Доўга я сядзеў скорчыўшыся; ніяк да памяці ня мог дайсьці. Аглумеў саўсім. Дый так аглумеў, што ня мог здаць сабе рахунку, як гэ-

